# КРЫВІНКА

САКАВІК
№ 5 (106)
2012 год

”Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай”.
**Ул. Караткевіч.**

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА




МЕРКАВАННЕ РЭДАКТАРА

## НА ШЛЯХУ ДА “ЖАЛЕЗНАЙ” ЗАСЛОНЫ

Апошнія падзеі ў Беларусі сведчаць пра тое, што існы рэжым не збіраецца мяняць сваю сутнасць. Кіраўнік краіны ўсё больш абвастрае сітуацыю, не звяртаючы ўвагі на тое, што сваімі дзеяннямі ён сам парушае агульнапрынятыя маральныя каштоўнасці.

Пачну з таго, што пасля чарговай паспяховай для яго мінскай лыжні ён даваў інтэрв’ю сваім журналістам. Пры гэтым ён здолеў абразіць міністра замежных спраў Нямеччыны Г.Вестэрвэле, маючы на ўвазе нетрадыцыйную сексуальную арыентаванасць апошняга. “Лепш быць дыктатарам, чым галубым”, – безапеляцыйна заявіў наш чыноўнік, які не жыве з сваімі жонкамі, але мае пазашлюбнае дзіця на сваім выхаванні. На думку многіх маіх сяброў, лепш ужо не мець дзетак зусім, чым не дапускаць маці да выхавання свайго дзіцяці.

Чарговае абвастрэнне адносін Беларусі з Эўразвязам пачалося пасля ўвядзення апошнім чарговых абмежаванняў на ўʼезд у краіны Эўразвязу лукашэнкаўскіх чыноўнікаў. Але калі еўрапейцы не хочуць некага бачыць у сябе дома, то яны маюць на тое поўнае права. А вось калі Лукашэнка абмяжоўвае выезд грамадзян Рэспублікі Беларусь за мяжу, ён парушае пры гэтым Канстытуцыю і Законы Рэспублікі Беларусь. Бо згодна Законаў за мяжу не могуць выязджаць толькі грамадзяне, якія не плацяць элементы, маюць якуюсьці грашовую запазычанасць або крымінальнікі. Усе астатнія могуць вольна перасякаць мяжу, калі маюць на тое візавы дазвол. Як бы наш кіраўнік ні імкнуўся паказаць сваё жаданне пакіраваць і тут, ён проста чарговы раз перакрочвае, парушае Законы, ім жа самім падпісаныя, і Канстытуцыю, свята выконваць якую ён кляўся нам ужо неадноўчы.

“Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, не скуеш толькі дум ланцугамі…” Менавіта гэтыя купалаўскія радкі ўзгадаў я, калі пачуў пра тое, што хлопцы, якія падазраваліся ў дачыненні да выбуху ў менскім метро, ужо растраляныя. Калі ў падобных выпадках дзесьці ў Амерыцы расследванне цягнецца гадамі, у нас усё склалася ўзорна хутка. Сёння – тэракт, заўтра – захоп падазраваных, праз паўгода – суд, менш чым праз год – расстрэл. І гэта пры тым, што нават у нашай краіне прыгавораныя да вышэйшай меры раней чакалі выканання прысуду па некалькі месяцаў.

Мяне асабіста кранула не смяротнае пакаранне, на адмену якога – я то ведаў дакладна – наш кіраўнік не пайшоў бы ніколі. Мяне балюча кранула крывадушша чыноўніка, які праз пару дзен пасля падпісання прысуду асмельваецца услых выказаць думкі, што ён вельмі спачувае мацерам растраляных… Ужо прывыклы да розных выкрунтасаў нашага кіраўніка, падобнага крывадушша я ад яго аніяк не чакаў.

Наогул, яго паводзіны ўсё больш і больш сведчаць пра тое, што Беларусь імкліва коціцца ў “надзейныя” абдымкі Расеі. Паводзіны Беларусі – гэта нібыта паводзіны малодшага брата, які не мае ні сілёнкі, ні выхавання, а кідаецца да дарослых дзецюкоў, каб зачапіць, ударыць ці хоць укусіць, бо ён чуе за спінай надзейнага абаронцу. Гэтаму старэйшаму брату ўзяць бы за вуха ды паставіць малодшага на месца, а ён стаіць, лыбіцца. Маўляў, няхай малое дзіцянятка падурэе. І тое малое звычайна заканчвае дрэнна і з раскрываўленай пысай і слязьмі бяжыць дадому.

Ад астатняга свету Беларусь хоча адгарадзіцца чарговай “жалезнай” заслонай і напужаць усіх мускуламі старэйшага брата. Толькі гісторыя сведчыць, што такія заслоны ненадзейныя і недаўгавечныя.

**Г.Станкевіч.**

### *У БАЛОТНЫХ ЯЛІНАХ*

*”Хаваючыся напалову ў тумане,*
*імчыць над змрочнай зямлёй*
*дзікае палянанне”.*
*У.Караткевіч.*

*У Балотных Ялінах жыве даўні страх,*
*Ані радасці, ані спакою.*
*Днём і ноччу лютуе раз’юшаны Стах,*
*Абвясціўшы народ свой ізгоем.*

*Зацугляныя коні імчаць і імчаць,*
*У дварах і сабакі не брэшуць.*
*Вастраверхія вусцішна дзіды стырчаць,*
*Караля тыя коннікі цешаць.*

*Рвецца д’ябальскім крыкам зняважлівы рог,*
*А навокал пакута пануе.*
*Дык калі ужо ціхае водгулле Бог*
*Галасоў занядбаных пачуе?*

*Там шчыруе яшчэ запалоханы птах,*
*І блакітам натхняецца бусел.*
*А ці знойдзем аднойчы мы згублены шлях*
*Да зямлі, што завём Беларуссю?*

**Н.Галавач.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## ЖАРСЦІ ПА ГАЛОЎНЫМ ДОКТАРЫ

Амаль тры месяцы бешанковіцкая райбальніца застаецца без кіраўніка. Пасля таго, як М.Я.Барзянкоў пасля вядомых падзей сышоў на пенсію, звольніўся і з’ехаў з раёна, абавязкі кіраўніка райбальніцы часова выконвае Керэмша А.В. У гэтым падвешаным стане ён знаходзіцца ўжо некалькі месяцаў.

Тым часам ходзяць чуткі, што на пасаду галоўурача могуць прызначыць зусім не яго, а кагосьці іншага. Вопытных кіраўнікоў, такіх, як Белавус В.М. ці Багдановіч В.І., якія маглі б стаць галоўным, у нашай медыцынскай установе хапае. Сярод іншых ёсць меркаванне, што пасада галоўнага доктара “пяройдзе” да Барзянкова А.М., сына былога кіраўніка. А яшчэ на практыцы вельмі часта на пасаду кіраўніка ў сённяшняй Беларусі прывозяць чыноўнікаў з іншых рэгіёнаў, так называемых “катоў у мяшку”.

Як бы там ні было, але пакуль што пасада кіраўніка ўстановы застаецца вакантнай, і вакансію тую запаўняць яўна не спяшаюцца. Вось тое і параджае мноства чутак і меркаванняў. Між тым, падобнае развіццё падзей – безуладдзе – гуляе не на карысць справе. Тым больш не на карысць справе гуляюць і метады, якімі карыстаюцца вышэйстаячыя чыноўнікі, прызначаючы ніжэйстаячых. Пры тым ніяк не ўлічваецца думка працоўнага калектыву, які, думаецца, лепш за ўсіх чыноўнікаў ведае, хто з дактароў заслугоўвае вылучэння на пасаду галоўнага. А да народнай думкі трэба было б неяк прыслухацца. Існая ж практыка вылучэння на галоўныя пасады “сваіх” стаўленнікаў вельмі часта прыводзіць у крэслы людзей часовых, некампетэнтных і проста шкодных для справы.

**Г.Станкевіч.**

### “КРЫВІНКА” Ў ІНТЭРНЭЦЕ

У сувязі з праблемай размяшчэння газеты “Крывінка” на партале http://haradok.belarda.org/ наша газета стала будзе размяшчацца на партале **http://kamunikat.org/** , дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: **http://kamunikat.org/krуvinka.html** , што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання.

## ПЛАТА ЗА ПАЛІКЛІНІКУ

Упачатку сакавіка віцэ-прэм’ер урада Анатоль Тозік на калегіі Міністэрства аховы здароўя прапанаваў увесці за наведванне паліклінікі сімвалічную плату – 5 000 рублёў. Гэтая плата дазволіла б, на думку віцэ-прэм’ера, эфектыўна змагацца з чэргамі. На яго думку, беларусы ўдвая часцей ходзяць у паліклініку, чым нашы суседзі, аж 13 разоў на год! Няўжо спадар чыноўнік не ведае, што сярэднестатыстычны немец ці англічанін сустракаецца з дактарамі сваёй краіны яшчэ часцей?

Мне ж здаецца, што такім чынам, за кошт самай беднай часткі насельніцтва, хочуць залапіць непасільны для паліцэйска-чыноўнічай краіны бюджэт. Бо праз тры гады ва ўсёю разгорнецца перадвыбарчая прапаганда перад новымі прэзідэнцкімі выбарамі. А, як вядома, кіраўнік нашай краіны напярэдадні мінулых выбараў заявіў, што за гэту пяцігодку ў медыцынскай галіне адбудуцца кардынальныя зрухі. Знікнуць чэргі, павысіцца культура абслугоўвання, і, як вынік, працягласць жыцця беларусаў павялічыцца. Зрабіць тое цывілізаванымі сродкамі не выходзіць: мы ўсе ў даўгах, як шаўках. Вось і пачынаецца прамацванне глебы.

Зразумела, што кожны з 100 ці 200-т наведвальнікаў, якія штодзень завітваюць у нашу раённую паліклініку, маюць думку адрозную ад тозікаўскай. Ды й Канстытуцыя ў нашай краіне сведчыць не на карысць платнай медыцыны. Але ж тое не перашкодзіла зрабіць платным ВУЗаўскае навучанне ў Беларусі. Прыйшла пара прыдумляць нейкае ноу-хау і ў медыцыне. Бо нізкая якасць абслугоўвання і вялізныя чэргі даўно з’яўляюцца падставай для высноў. Толькі ў простага чалавека, якім ён бачыць будучыню нашай медыцыны, як бачна, пытаць ніхто не збіраецца.

**У.Ліпскі.**

### АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Крывінка» паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць, то патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Крывінкі» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Крывінка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

## ПРА САБАЧАЕ ЖЫЦЦЁ

Даўным-даўно, калі чалавек і сам быў яшчэ часткай прыроды, ён прыручыў сабаку. Верны сябар дапамог яму стаць уладаром у свеце, а потым аказаўся непатрэбным. Не, сабакі дапамагаюць чалавеку і сёння. Але не ўсе. Вельмі часта яны пачынаюць яму замінаць. І тады іх ловяць і забіваюць.

Вось і ў нашым раёне за мінулы год, згодна камунгасаўскай інфармацыі, адстраляна 35 беспрытульных сабак і кошак. За мінулы год зарэгістравана 5 выпадкаў, калі валацужныя сабакі кусалі выпадковых людзей. Гэта з’явілася падставай для таго, каб і ў 2012-м годзе раённы выканаўчы камітэт зноў узаконіў паляванне на сяброў чалавека.

Хаця ў цывілізаваных краінах ёсць іншае вырашэнне сабачых праблемаў, і тое ніякі не сакрэт. У такіх краінах для сабак будуюць прытулкі, дзе іх дагледзяць валанцёры-дабраахвотнікі. Я ведаю шмат людзей і ў нашым райцэнтры, якія штодзень дабраахвотна кормяць бесхацінных сабак чалавека. З якой радасцю чакаюць іхнія выхаванцы сваіх ратавальнікаў! Але і тыя бесхацінцы знаходзяцца пад пагрозай быць забітымі падчас чарговай аблавы. А яны, як сведчыць зацверджаны райвыканкамам графік адстрэлу, будуць праводзіцца ў 2012-м годзе з завіднай рэгулярнасцю кожную суботу, не выключаючы нават дзень вялікага свята Дабравесця – 7-га красавіка.

Той з раённых чыноўнікаў, хто ставіў свой подпіс пад графікам, несумненна, вялікі аматар усяго жывога. Мусіць, ён толькі вельмі хоча, каб на вуліцах нашага райцэнтра не было бясхатніх сабак. А вось знайсці іншае рашэнне сабачага пытання для чыноўніка не з’яўляецца магчымым. Хаця ў раёне столькі кінутых будынкаў, дзе можна абсталяваць прытулак для чацвераногіх сяброў, столькі сталовых, адходамі ад ежы адкуль можна пракарміць хоць цэлую сотню сяброў чалавека.

Як нам перайсці ад забойства сабак да іх утрымання ў спецыяльным гадавальніку, існая ўлада ніколі не вырашыць. Бо для гэтага трэба спачатку стварыць людскае жыццё для людзей, якое б крыху адрознівалася ад жыцця валацужных сабак.

**Л.Паўлава.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў РАЁНЕ

Дэмаграфічная сітуацыя апошніх гадоў у нашым раёне ўпарта не хоча паляпшацца. Колькасць дзетак, якія нарадзіліся, штогод складае адну і тую ж лічбу. Яна вагаецца ў межах 150 чалавек. Толькі ўдкмайцеся: на раён з насельніцтвам амаль у 20 000 чалавек, штогод нараджаецца 150 дзетак! Так і ў 2011-м годзе колькасць народжаных склала 149 чалавек. 76 з іх нарадзілася ў Бешанковічах. То бок у горадзе можна адкрыць тры нармальныя класы з колькасцю вучняў 25 чалавек. Гэта на тры школы: СШ №1, СШ №2 і гімназію. 72 дзіцяці нарадзілася за 2011-ы год на сяле. І тых народжаных трэба падзяліць на дзесяць ці адзінаццаць існуючых сёння сярэдніх школ. І калі сітуацыя ў Бачэйкаве, Уле ці Астроўне яшчэ не самая крытычная, бо ім дастаецца па 7 – 10 дзетак у першыя класы, то рэшта школ гібее з мінімумам дзетак. Некалькі сярэдніх школ раёна сёлета маюць колькасць дзяцей ад 20 да 30 чалавек у суме ва ўсіх класах! І гэта нягледзечы на тое, што некаторыя з школ былі пераўтвораныя ў школы-сады, то бок дзеткі там не толькі вучацца, але і выхоўваюцца ў сістэме дашкольнага выхавання трохшасцігодкі. (Напрыклад: Ржаўская, Сініцкая, Рубежская школы-сады).

Карацей кажучы, мы прыйшлі туды, куды павінны былі прысці, выконваючы ўсе планы і заданні, якія нам даводзілі зверху. Вось толькі галоўны план па нараджэнню дзетак нам не давалі, бо яго давесці нельга. Ён вынікае сам сабой з усяго нашага жыцця. Калі яно цудоўнае і чалавек мае магчымасць нармальна жыць, працаваць, кахаць, то дзеці з'явяцца самі сабой. Калі ж у сістэме наступае нейкі збой, то найперш гэта паказвае дэмаграфія.

Здаецца(так нам убіваюць у галовы шматлікія ідэолагі), што Беларусь хітра абышла усе крызісы, устойліва развіваецца. Чаму ж тады дэмаграфічныя паказчыкі крычаць пра зваротнае? Чаму ў нас штогод нараджаецца ўтрая менш дзетак, чым тое патрэбна для нармальнага развіцця рэгіёна? Ды і з тых дзетак 30 – 40 % нараджаецца з адхіленнямі ў псіхафізічным развіцці. Значыцца, нам хлусяць. Значыць, у нашай краіне ўсё не так добра, як у тым нас стараюцца пераканаць.

З пачаткам эпохі незалежнасці Беларусь сапраўды перажывала часовыя цяжкасці. Дзякуючы ініцыятыве, што зыходзіла ад Першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за некалькі гадоў краіна пераадолела тыя цяжкасці. Але наперад рухацца яна не стала, бо сістэма кіравання, якую і стварыў той ёйны Першы Прэзідэнт, не дазваляла імкліва пайсці наперад. Паступова Беларусь пераўтварылася ў паліцэйска-чыноўніцкую дзяржаву, дзе простаму чалавеку не засталося месца. Ён быў змушаны піць, красці і весці жабрацкае існаванне. Асабліва ў сельскай мясцовасці. А жабракі, як вядома, дзяцей часцей за ўсё не заводзяць. І правільна робяць, бо такіх дзетак яны не змогуць ні пракарміць, ні прыстойна апрануць. І тое не дапаможа зрабіць ніводная сацыяльная служба дзяржавы.

Галоўнай жа прычынай таго, што наша вёска імкліва вымерла, з'явілася праводзімая тут палітыка захавання калгасна-прыгоннай сістэмы. Як вынік, усе здаровыя сілы з вёскі кудысьці з'ехалі ў пошуках лепшай долі ці вымерлі. Тыя ж, хто застаўся ці прыехаў, застаючыся на рабскіх правах, аніяк не садзейнічалі ўздыму сяла. Ім будавалі "лукашоўкі", то бок хаціны, дзе б яны маглі жыць і нараджаць дзетак. Але тыя хаціны праз некалькі гадоў часцей усяго пачынаюць развальвацца, а людзі зноўтакі з'язджаюць у пошуках лепшай долі.

І такая палітыка працягваецца праводзіцца далей! Але сёння Беларусь ужо не мае сродкаў, каб пачынаць праводзіць нейкія дзейсныя рэформы. А разлічваць на крэдыты аніяк не прыходзіцца: мы ж пасварыліся з большасцю цывілізаваных краін Еўропы, ды й сітуацыя ў прамысловасці таксама пакідае жадаць лепшага. Валавы замежны доўг Беларусі на 01.01.2012 склаў аж 34 мільярды даляраў!

Што застаецца рабіць? Чакаць пакуль нам давядуць план нараджальнасці на кожную сям'ю да 2025-га года? Або сказаць на выбарах рашучае "Не!" праводзімай палітыцы? Вырашаць нам з вамі.

**Г.Станкевіч.**

АБАРАНІЦЬ РОДНАЕ СЛОВА

# Справы таварыства беларускай мовы

Сярод шматлікіх спраў, якімі займаецца ТБМ, нам трэба знайсці час і сродкі яшчэ для адной справы. Яна непасрэдна датычыцца нашай будучыні, дакладней кажучы, тых дзетак, якія хутка народзяцца і будуць размаўляць па-беларуску.

Справа ў тым, што многія маладыя бацькі, нават пры вялікім асабістым жаданні, не ведаюць, як зрабіць першыя крокі ў выхаванні свайго дзіцяці, каб выхаваць яго беларусам. Бо самі бацькі жывуць у такім асяродку, дзе яны пазбаўлены магчымасці нават чуць родную мову. А жаданне ў іх, каб дзеткі пачалі гаварыць на роднай мове, ёсць, толькі бацькі часта не ведаюць з чаго пачаць. Пазней, калі ў дзіцяці ўжо сфарміраваны асновы светаўспрымання на чужой мове, гэта зрабіць значна цяжэй, а парой і немагчыма.

Вось мне і падумалася: а ці не скласці ТБМ кніжку, якою трэба надзяліць усе ЗАГСы краіны. Кожная маладая пара, якая б заключала шлюб, атрымоўвала б яе ў падарунак. У гэтай кніжцы на першай старонцы мусіць быць спіс беларускіх імён хлопчыкаў і дзяўчынак, якімі традыцыйна называліся беларусы, і якімі, несумненна, будуць называцца нашы дзеткі ў будучыні. На наступных старонках – першыя словы, якімі мусіць авалодаць дзіця пасля нараджэння (татуля, мамуля, дзядуля, бабуля і г. д.) з малюнкамі, якія некалі паслужаць і дзеткам у якасці першай кніжкічытанкі. Далей мусяць быць прыклады ўжывання некалькі дзесяткаў найбольш распаўсюджаных дзеясловаў, якім трэба навучыць дзіця найперш. (Напрыклад: дай, вазьмі, не чапай і г.д.) Далей усе правілы беларускага этыкету: як правільна прывітацца і развітацца, пажадаць смачна есці і шчаслівай дарогі, як пачаць размову па тэлефоне і як запытаць нешта ў незнаёмага. А яшчэ ў кніжцы можна намаляваць хату і яе пакоі і надпісаць, як што ў пакоях называецца па-беларуску. А таксама што і як называецца ў аўтамабіля і камп'ютара, як называецца мэбля і сталовыя прыналежнасці, грыбы, ягады, травы, птушкі і звяры і г.д..

Кніжку трэба ўпрыгожыць вершыкамі, беларускімі прыказкамі і прымаўкамі. На першых старонках мусяць абавязкова быць розныя беларускія калыханкі, казкі. Далей дзіцячыя вершыкі-загадкі пра звёл і птушак, пра надвор'е і – усё тое, чаго сёння не мае беларуская сям'я, каб выхоўваць сваіх дзетак на беларускай мове, з улікам усіх беларускіх традыцый.

Кніжку трэба зрабіць з густам. Да распрацоўкі яе трэба падключыць нашых вядомых пісьменнікаў, знаўцаў беларускіх традыцый, усіх тых, хто адчувае, што ён можа паспрыяць справе. Яна павінна стаць бестселлерам і карыстацца попытам. Выдаць яе можна за народныя грошы.

**Г.Станкевіч.**

P.S. Гэты артыкул быў апублікаваны ў газеце "Наша слова" №12 ад 21-га сакавіка 2012 года.

ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

# ВЫПАДАК НА СМЕТНІКУ

Яшчэ гадоў восем-дзесяць таму ў Старых Ранчыцах не ведалі, што такое сметнік. Кожны ліквідаваў свае адкіды, як толькі мог. Сукі і абрэзкі палілі ў печках, метал складзіравалі дзесьці на задворках, а поліэтыленавыя бутэлькі і іншая ўпаковачная тара тады была яшчэ даволі рэдкай. Але пакрысе цывілізацыя дабралася і сюды. Ужо гадоў пяць, калі не больш, як за паўкіламетра ад вёскі проста на беразе меліяратыўнага каналу адкрыўся сметнік. Дакладней кажучы, яго адкрылі жыхары Бешанковіч, што прывезлі на трактары і выкулілі проста пад кусты сваё смецце. Распачатую справу прадоўжылі і расшырылі. Смецце сюды павезлі з усёй акругі, тым больш, што за смецце, завезенае на палігон блізу вёскі Дразды, трэба было нешта плаціць.

Потым сметнік закрывалі і зноў афіцыйна адкрывалі. Ужо летась перад прыездам у Бешанковічы кіраўніка краіны ён разросся ў даўжыню амаль на цэлы кіламетар. Везлі сюды ўсё, што ў райцэнтры траплялася пад нагамі. Пад восень сметнік згарнулі бульдозерам, і жыццё на ім прыціхла. Але чатырнаццатага сакавіка адкрыўся новы сезон: паўз маю хаціну ў бок сметніку пранёсся трактар з прычэпам, які быў нечым напоўнены даверху. Падазраючы няладнае, я паведаміў пра тое ў раённую прыродаахоўную інспекцыю. Мне не паабяцалі нешта канкрэтнае, мусіць, не было пад рукой транспарту. Тады я захапіў лічбавік і кінуўся следам за трактарам. Ён стаяў шжо з пустым прычэпам, каля якога завіхаўся трактарыст. Гурба свежанькіх абрэзкаў і шчэпак ляжалі пры дарозе.

Зразумела, што ні прозвішча, ні арганізацыі трактарыст мне не паведаміў. Мне засталося зняць толькі буйным планам ягоны трактар, так, каб быў бачны нумар. А потым усё ж прымчалася прыродаахоўная інспекцыя. Інспектар папярэдзіў кіроўцу пра неабходнасць з'явіцца ў інспекцыю за штрафам, а таксама, каб той не забыўся прыбраць за сабой смецце з дарогі. Аказваецца, смецце з прыватных падворкаў сюды прывозіць можна, а вось з арганізацый – не. Але трактары сюды будуць ісці і ісці цэлае лета, бо ніхто іх тут не кантралюе, з арганізацыі яны ці з прыватнага сектару.

**Г.Станкевіч.**

P.S. Ужо праз чатыры дні пасля гэтага выпадку ў бок сметніку панёсся чарговы смецявоз, а праз колькі часу ён ляцеў ужо назад пусты. У той дзень часу, каб занімацца ягонай праверкай, у мяне не было. Як яго амаль заўсёды няма і ў прыродаахоўнай інспекцыі, якая, зразумела, не ўкантралюе ўсе раённыя сметнікі.

Тым не менш трэба, каб б хтосьці з прыродаахоўнай інспекцыі пад'ехаў да неабыякавых грамадзян, растлумачыў ім іхнія правы і папрасіў садзейнічання агульнай справе. Тады несанкцыянаванага смецця ў нашым і так засмечаным па самыя вушы раёне было б значна меней.

КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ



# БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ

Дваццатага і дваццаць першага сакавіка ў сценах Лужаснянскай гімназіі для таленавітых дзетак(цяпер афіцыйная назва ўстановы "Кадэцкі корпус") гучала беларуская аўтарская песня ў выкананні Г.Станкевіча. У гэты час тут праходзіла рэспубліканская алімпіяда па рускай мове, у якой удзельнічалі пераможцы абласных алімпіяд з усіх абласцей рэспублікі. Пасля выканання напружаных заданняў падлеткі атрымалі магчымасць сустрэцца з беларускім словам, якое гучала тут пад гітарную музыку. Кожны з абодвух канцэртаў цягнуўся каля гадзіны, цягам якой удзельнікі алімпіяды маглі пазнаёміцца з творчасцю Г.Станкевіча, задаць яму хвалюючыя пытанні і атрымаць у падарунак кнігу з аўтарскім аўтографам.

Зразумела, што дзеці вучаць у школах беларускую мову ў межах школьнай праграмы, але падобнае мерапрыемства, дзе б цалкам гучала беларуская песня, яны ніколі не наведвалі. На мерапрыемстве гучалі песні пра беларускую вёску, родны край, школу і каханне. Школьнікі не шкадавалі апладысментаў, а на пытанне аўтара, ці спадабалася ім мерапрыемства, горача запэўнілі: "Вельмі!" Асабліва іх ўразілі песні Уладзіміра Высоцкага ў перакладзе Г.Станкевіча на беларускую мову. Прысутныя пагадзіліся, што яны гучаць па-свойму адметна, не губляючы пры тым і аўтарскай адметнасці. Настаўніцы –кіраўніцы абласных дэлегацый пыталіся ў аўтара, выступае ён толькі ў межах вобласці, ці можна дамовіцца на выступленне па-за яе межамі.

Хацелася б верыць, што падобныя сустрэчы з падлеткамі стануць рэгулярнымі, тым больш, што для арганізатараў мерапрыемства гэта не каштавала ні капейкі. Выдаткі на праезд выканаўца аўтарскай песні ўзяў на сябе, платы за выступленне не патрабаваў.

**М.Васільеў.**

***На здымку:*** пасля канцэрта.

ЕЎРАПЕЙСКІ НАПРАМАК

# ПАШЫРЭННЕ САНКЦЫЙ ЕС ДАТЫЧЫЦЬ БІЗНЭСУ, ШТО ПАДТРЫМЛІВАЕ РЭЖЫМ

У ВЫНІКОВЫМ ДАКУМЕНЦЕ, ПРЫНЯТЫМ 23 САКАВІКА Ў БРУСЕЛІ НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА МІНІСТРАЎ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ КРАІН ЕС, ЗАЗНАЧАЕЦЦА: СПІС ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСІ, СУПРАЦЬ ЯКІХ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ САНКЦЫІ, ПАШЫРАНЫ ЗА КОШТ «ЛЮДЗЕЙ, АДКАЗНЫХ ЗА СУР'ЁЗНЫЯ ПАРУШЭННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА АБО РЭПРЭСІІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ І ПАЛІТЫЧНАЙ АПАЗІЦЫІ».

Савет ЕС таксама прыняў рашэнне аб уключэнні ў спіс бізнесменаў і кампаній, якія «атрымліваюць выгаду ад рэжыму або падтрымліваюць яго», і пакідае за сабой магчымасць далейшага пашырэння абмежавальных мер на сваіх наступных пасяджэннях, калі палітзняволеныя не будуць вызвалены.

Еўрасаюз зноў заклікае беларускія ўлады неадкладна вызваліць і рэабілітаваць усіх палітычных зняволеных.

У дакументе асуджаецца адмова ў задавальненні касацыйнай скаргі праваабаронцы Алеся Бяляцкага і асуджэнне на два гады і адзін месяц пазбаўлення волі актывіста апазіцыі Сяргея Каваленкі. Апрача таго, гаворыцца аб «сур'ёзнай занепакоенасці ЕС» адносна інфармацыі аб магчымым прымяненні катаванняў і жорсткім абыходжанні ў дачыненні да палітзняволеных у турмах, у тым ліку да Андрэя Саннікава, Мікалая Статкевіча, Дзмітрыя Бандарэнкі, Дзмітрыя Дашкевіча і Мікалая Аўтуховіча.

Савет ЕС асудзіў прывядзенне ў выкананне смяротных прысудаў Уладзіславу Кавалёву і ДзмітрыюКанавалаву, зноў заклікаў беларускія ўлады да ўвядзення мараторыя на смяротную кару і зазначыў, што Еўрасаюз выступае супраць гэтага віду пакарання пры любых акалічнасцях.

Еўрасаюз зноў заклікаў беларускія ўлады спыніць усякі пераслед прадстаўнікоў апазіцыі, грамадзянскай супольнасці, праваабаронцаў, журналістаў і не абмяжоўваць іх свабоду перамяшчэння. «ЕС асуджае задушэнне мірных пратэстаў і сістэматычнае выкарыстанне судовай сістэмы для рэпрэсій, у тым ліку ў дачыненні да мірных пратэстантаў, — гаворыцца ў дакуменце. — ЕС таксама моцна занепакоены зменамі ў заканадаўстве, якія яшчэ больш абмяжоўваюць правы беларускіх грамадзян на свабоду сходаў, асацыяцый і доступу інфармацыі ў сетцы інтэрнэт».

Апрача таго, ЕС мае намер праінфармаваць міжнародную і нацыянальныя хакейныя федэрацыі аб «адсутнасці ў Беларусі павагі да правоў чалавека, вяршэнства закону і дэмакратычных прынцыпаў».

У дакуменце зазначаецца, што ЕС «глыбока прыхільны падтрымцы беларускага народа і грамадзянскай супольнасці і супрацоўніцтву з імі, а таксама дэмакратычным памкненням беларусаў». Савет ЕС вітае рашэнне аб запуску праграмы Еўрасаюза «Еўрапейскі дыялог аб мадэрнізацыі» з беларускім грамадствам, якая прадугледжвае неабходныя рэформы ў Беларусі, а таксама магчымую падтрымку ЕС у сувязі з гэтым.

Еўрасаюз таксама заклікае беларускія ўлады пачаць нацыянальны дыялог з грамадзянскай супольнасцю і апазіцыяй, каб «пракласці шлях» для правядзення парламенцкіх выбараў у 2012 годзе ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі і стандартамі, заклікае супрацоўнічаць з АБСЕ і прытрымлівацца ўзятых на сябе абавязацельстваў як краіна — удзельніца гэтай арганізацыі, паведамляе БелаПАН.

ЕС зноў заяўляе пра сваю гатоўнасць пачаць перамовы па пагадненнях аб аблягчэнні візавага рэжыму і аб рэадмісіі, якія «ўмацавалі б кантакты паміж людзьмі, што пайшло б на карысць жыхарам Беларусі», і шкадуе «аб неканструктыўнай пазіцыі беларускіх уладаў, якія не адказалі дагэтуль на ліст, накіраваны ў чэрвені 2011 года, што заклікаў пачаць перамовы».

ДЗЕНЬ ВОЛІ

# ПЛЕБІСЦЫТ У ІМЯ БЕЛАРУСІ

СВЯТКАВАННЕ ДНЯ ВОЛІ – ГЭТА ПУБЛІЧНЫ АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫ ЎРОК ГІСТОРЫІ, ПЛЕБІСЦЫТ БЕЛАРУСАЎ НА ВЕРНАСЦЬ ПАМЯЦІ ПРОДКАЎ, НАЙВЫШЭЙШАЯ ПРАЯВА СІЛЫ БЕЛАРУСКАГА ДУХУ І ПРАГІ ДА СВАБОДЫ.

Любая форма адзначэння гэтага Свята – годная і патрэбная.

Але толькі ў супольным парыве, талакой, беларусы патрапляюць рабіць больш і найлепш, дасягаць амаль немагчымага.

Асабліва важным ёсць шанаванне нашага Свята сёння - у варунках дыктатуры і дзяржаўнага пераследу беларусаў-патрыётаў.

Святкаваць Дзень Волі –

- гэта віншаваць блізкіх і сяброў;
- гэта аздобіць нацыянальнымі сімваламі дом, машыну, вопратку;
- гэта ўшанаваць памяць герояў Беларусі;
- гэта праявіць салідарнасць з сённяшнімі змагарамі, асабліва з тымі, хто, як Зміцер Дашкевіч, Сяргей Каваленка, Мікола Статкевіч, Андрэй Саннікаў, Павел Севярынец ды іншыя палітвязні, несправядліва кінуты за краты турмаў;
- гэта ладзіць адмысловыя выставы, чытанні і канферэнцыі;
- гэта сабрацца за святочнай бяседай;
- гэта размаўляць на мове продкаў і пісаць дыктоўкі па неўміручых тэкстах;
- гэта збірацца на мітынгі і ісці шэсцямі па вуліцах гарадоў, мястэчак ды вёсак.

Ідэалы Беларускай Народнай Рэспублікі – вельмі актуальныя для нас сёння і будуць такімі надалей. Нам след будаваць сапраўды Беларускую і сапраўды Народную Рэспубліку, нашу краіну, дзе мы гаспадары. БНР – не проста сімвал, а альтэрнатыва РБ. Каштоўнасць незалежнасці – абсалютная для вольнага народу. Наша дзяржаўніцкая традыцыя і намаганні, зробленыя дзеля еднага адназлення і захавання, - унікальныя.

Беларусь жыве і будзе жыць тады, калі яна не толькі жыве, але і дынамічна развіваецца, стварае найлепшыя ўмовы для самарэалізацыі сваіх грамадзянаў, шануе сваю мову, культуру і знаходзіць паразуменне сярод суседзяў.

Беларусы!

Згадайма, як бягуць мурашы па скуры пасля магутнага воклічу "Жыве Беларусь"!

Згадайма, як трымціць сэрца ад гонару за велічна ўзняты бел-чырвона-белы сцяг са святой "Пагоняй"!

Каму, як не нам, абараняць нашу незалежнасць, свабоду, мову і права на годнае жыццё!

Мы маем шанец выйсці ў Дзень Волі на галоўны праспект сталіцы, каб прадэманстраваць нашу пашану да гісторыі і рашучасць дзеля будучыні.

Будзьма ж разам 25 сакавіка на Акадэміі Навук! Хай наш сцяг лунае над галовамі і натхняе нас на лепшае.

Жыве Беларусь!

**Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ.**

ПАМЫЛКОВЫ АДКАЗ

# Эксперт: Ермакова атаясамляе сябе з Маўродзі

КІРАЎНІК АНАЛІТЫЧНАГА ЦЭНТРА «СТРАТЭГІЯ» ЛЕАНІД ЗАІКА НАЗВАЎ ПАМЫЛКІ КІРАЎНІКА НАЦЫЯНАЛЬНАГА БАНКА БЕЛАРУСІ НАДЗЕІ ЕРМАКОВАЙ, ЗА ЯКІЯ, У СВОЙ ЧАС, СТАВІЎ СТУДЭНТАМ «ДВОЙКІ».

У ходзе «прамой лініі» у газеце «Рэспубліка», якая была апублікаваная, кіраўнік Нацбанка Беларусі Надзея Ермакова заявіла, што «заканадаўствам не прадугледжана кампенсацыя укладчыкам тых грошай, якія абясцэньваюцца ў працэсе інфляцыі».

Разам з тым, яна сказала, што Беларусь - гэта справядлівае дзяржава, і абгрунтавала сваё меркаванне: «Улічваючы тое, што многія грамадзяне ў мінулым годзе сапраўды панеслі пэўныя страты ў сувязі з дэвальвацыяй і высокай інфляцыяй, дзяржавай зараз актыўна прымяняюцца іншыя кампенсацыйныя механізмы - павялічваюцца пенсіі, дапамогі, расце заработная плата».

Вядомы беларускі эканаміст Леанід Заіка лічыць, што кіраўнік Нацыянальнага банка Беларусі «зрабіла вельмі дрэнную рэч». Як сказаў эксперт карэспандэнту сайта «Таварищ.online», «яна атаясамляе сябе з Маўродзі. Як навуковец, спецыяліст у галіне эканамічнай тэорыі хачу падкрэсліць, што насельніцтва страціла ад дэвальвацыі ».

Паводле яго слоў, насельніцтва да 2011 года аддавала грошы, якія ў міжнародных супастаўлення маглі раўняцца, умоўна, 3 мільярдам даляраў. «А вось пасля дзеянняў Нацбанка, праўда, сама Ермакова да гэтага не датычная, трэба быць сумленным, замест 3 мільярдаў застаўся адзін. Гэта значыць свае абавязацельствы банкі не выканалі, але не выканалі па прычыне памылак менавіта Нацыянальнага банка», - перакананы эканаміст.

Ён кажа, што калі б Беларусь была крайнай з моцнай прававой сістэмай, то індэксаваць прыйшлося б. А меркаванне Ермаковай аб павышэнні, лічыць некампетэнтным. «Нейкія выплаты, рост заробкаў і пенсій не маюць ні-я-ка-га дачынення да пытання кампенсацыі. У гэтым галоўная тэарэтычная памылка спадарыні Ермаковай, - заяўляе Заіка. - Зберажэнні не маюць ніякага дачынення да грашовых патокаў, да патокаў даходаў, якія ствараюцца цяпер. За такія памылкі я ў свой час ставіў «двойкі» студэнтам, сярод якіх, напэўна, былі і калегі Ермаковай».

ШТУЧНЫ КУРС

# КУРС РУБЛЯ ОПЯТЬ ПОДДЕРЖИВАЕТСЯ ИСКУССТВЕННО

В МАРТЕ СПРОС НА ДОЛЛАРЫ ПРЕВЫСИЛ ПРЕДЛОЖЕНИЕ. ЧТОБЫ НЕ ДОПУСТИТЬ ОСЛАБЛЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО РУБЛЯ, НАЦИОНАЛЬНОМУ БАНКУ ВНОВЬ ПРИШЛОСЬ ПРИБЕГНУТЬ К ВАЛЮТНЫМ ИНТЕРВЕНЦИЯМ.

Такой вывод делает interfax.by, основываясь на данных Белорусской валютно-фондовой биржи. В период с 1 по 26 марта на торгах БВФБ валовый спрос на доллары превысил предложение почти на 94 миллиона USD. По логике курс белорусского рубля по отношению к американской валюте должен был снизиться. Но на практике он вырос, хотя и незначительно, что «свидетельствует о возобновлении валютных интервенций со стороны НББ после почти 4-месячного перерыва».

Есть и другие основания полагать, что курс рубля поддерживается искусственно. Как пишет «Белгазета», «показатели денежной массы пошли в гору обескураживающими темпами».

В феврале объём наличных денег (показатель М0) увеличился на 12,7%, денежный агрегат М1 – на 13,4%, рублевая денежная масса (М2) – на 9%. Широкая денежная масса на начало марта составила 114,9 триллиона рублей – большего показателя М3 в истории Беларуси не было.

Тем, для кого все эти М0, М1 и так далее – темный лес, поясним: печатный станок вновь включился. И это еще до посевной, на которую потребуется почти 10 триллионов рублей.

Кстати, инфляция в Беларуси с начала года составила уже около 5%, а вот рубль за этот же период не подешевел, а подорожал по отношению к доллару более, чем на 4%. Обычно так не бывает.

Однако всё это цветочки по сравнению с нашими «блестящими» перспективами. Помимо валютных интервенций на бирже, Национальный банк сейчас стерилизует рублевую массу посредством депозитов и краткосрочных облигационных займов аж под 30%. Но долго так продолжаться не может. Тем более, что уже объявлено про планируемое снижение ставки рефинансирования. А вместе с ней упадут и проценты по депозитам, как для субъектов хозяйствования, так и физических лиц. Что автоматически сделает вклады в национальной валюте менее привлекательными. В результате часть держателей начнет избавляться от белорусских рублей. Возрастет спрос на иностранную валюту. А в итоге – очередная девальвация: плавная или обвальная.

Даже если вышеизложенный сценарий каким-то чудом удастся предотвратить, рубль это в среднесрочной перспективе не спасает. Реформы в экономике вновь отложены в долгий ящик, а это значит, что причины, которые привели к девальвациям 2009 и 2011 гг., не устранены, пишет «Салідарнасць». Более того, власти вновь собственноручно организовывают очередной кризис, настаивая на повышении зарплаты до 500 долларов в течение года. Так что, очередной обвал белорусского рубля – это лишь вопрос времени.

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

# ЧАМУ БЕЛАРУСЫ СМУТКУЮЦЬ АБ СВАІХ ТЭРАРЫСТАХ?

КАВАЛЁВА І КАНАВАЛАВА ПРЫЛІЧЫЛІ ДА АХВЯРАЎ ВЫБУХУ, ЗА ЯКІ ІХ РАССТРАЛЯЛІ.

Рэакцыя беларусаў, якія лічаць, што віна Кавалёва і Канавалава не была даказаная, выявілася вельмі хутка. У сацыяльных сетках многія тут жа паставілі аватары з жалобнай стужкай і надпісам «15 +2 = 17»: да пятнаццаці якія загінулі ў выніку выбуху народ дадаў яшчэ двух. Беларускія сучасныя мастакі зрабілі некалькі плакатаў, на адным з якіх твар Кавалёва заліта крывёю, паэты напісалі вершы-рэквіемы. У «Фэйсбуку», на старонцы Таццяны Кавалёвай, сястры Уладзіслава, людзі пакідаюць спачуванні, падобныя адзін на аднаго - прыміце шчырыя спачуванні, трымайцеся, смуткуем.

Партрэт пакаранага Уладзіслава Кавалёва з'явіўся каля станцыі метро «Кастрычніцкая» ў Менску, на якой адбыўся выбух 11 красавіка 2011 года. Побач з выхадам са станцыі ўстаноўлена мемарыяльная таблічка, мінчане ўжо год нясуць да яе кветкі ў памяць аб загінуўшых. Партрэт Кавалёва з жалобнай стужкай прастаяў некалькі дзясяткаў хвілін, да яго паспелі паставіць запаленую царкоўную свечку і ўскласці кветкі. Пасля гэтага чалавек у цывільным, праўдзівы род заняткаў якога выдаваў слухаўка сувязі ў вуху, партрэт панёс, а двух мінчанак, якія спрабавалі пакінуць па дзве гваздзікі каля яго, адвялі ў стаялы непадалёк мікрааўтобус.

Нарад АМАПу дзяжурыць у Віцебску ў дамоў, дзе жылі Кавалёў і Канавалаў, да пад'езда не падпускаюць людзей з жалобнымі букетамі, некалькі чалавек затрымалі, але пазней адпусцілі без складання пратаколу. Суседзі сям'і Кавалёвых ўвесь вечар ішлі да маці пакаранага з выразам спагады, а камусьці з віцябчан атрымалася патрапіць у дом і ўскласці кветкі з чорнай стужкай і паставіць запаленую свечку ў кватэры Кавалёвых. Некалькі свечак стаіць і ў школы, дзе вучыліся пакараныя. Днём у нядзелю партрэт Кавалёва павесілі ў пераходзе ў віцебскай плошчы Перамогі, дзе адбыўся адзін з выбухаў, у якіх абвінавацілі Кавалёва і Канавалава.

Кветкі і партрэт аднаго з пакараных па справе аб выбуху ў мінскім метро з'явіліся ля амбасады Беларусі ў Францыі. У Вільні беларускую амбасаду «закавалі ў кайданкі» - замацавалі іх паміж прутамі агароджы, гэта мае на ўвазе, што Беларусь - паліцэйская дзяржава. У Брусэлі на беларускай амбасадзе зроблена графіці чырвонай фарбай: «Гэта пасольства забойцы Лукашэнка, а не краіны Беларусь».

Каля амбасады Беларусі ў Маскве ўзмоцнена ахова, супрацоўнікі асцерагаліся несанкцыянаваных акцый. Да будынку амбасады на Марасейцы вечарам у суботу і ўсё нядзелю прыходзілі людзі, прынослі кветкі і свечкі да партрэтаў пакараных. Было праведзена некалькі адзіночных пікетаў. Людзі стаялі з плакатамі «Супраць смяротнага пакарання!» і «Іх забілі па капрызе Лукашэнку!». А позна вечарам сабраліся каля 40 чалавек, якія ўсклалі кветкі і запалілі памінальныя свечкі.

Маці расстралянага Уладзіслава Кавалёва ўпэўненая, што з яе сынам расправіліся, каб схаваць сляды страшнага злачынства. Яна заявіла, што будзе змагацца супраць тых, хто сапраўды падарваў бомбу ў метро:

-Яны з ім ўправіліся, таму што Уладзік ў судзе праўду сказаў. Хто вінаваты? Толькі не гэтыя хлапчукі. З Уладам яны разлічыліся толькі за тое, што праўда выйшла. Яны не чакалі. Яны Уладу прыгразілі. Калі Улад памяняе паказанні ў судзе, яго чакае вышэйшая мера. Улад не спалохаўся. Ён усё гэта распавёў. Зразумейце, усё пайшло не па сцэнары. І цяпер усё гэта выйшла вонкі. Яны выдатна ведаюць, хто гэта зрабіў, хто падарваў метро. Ні Уладу, ні Дзімку гэта не трэба было, зразумейце! Я думаю, што зараз, дзякуючы ўсяму гэтаму, увесь свет падымецца і будзе расследаванне сапраўды так, як трэба, а не проста, што я адна тут змагалася, што я адна супраць іх ішла. Яны мне адпомсцілі, разумееце? Гэта проста помста маці. Цяпер я думаю, што сапраўды не спыніся ні перад чым. Здзіўляе паспешлівасць, з якой прысуд быў прыведзены ў выкананне: аб тым, што Лукашэнка адмовіў Кавалёву ў памілаванні стала вядома толькі 14 сакавіка, і ўжо праз два дні асуджаных расстралялі, нягледзячы на тое, што не былі нават выкананыя прававыя працэдуры. Праваабаронца Тацяна Равяка здзіўляецца:

- Беларускія ўлады захацелі падмануць нават камітэт па правах чалавека ААН, таму што паведамлялі, што скарга ў камітэт па справе Кавалёва і Канавалава не можа быць разгледжана, паколькі спачатку павінны быць выкарыстаныя ўсе нацыянальныя механізмы - наглядная скарга і памілаванне. Аднак, як усе ўжо ведаюць, адвакатам не далі магчымасці падаць наглядную скаргу, і, каб пазбегнуць ўздзеяння ААН, маментальна пакаралі смерцю асуджаных.

Эксперты мяркуюць, што такое грэбаванне міжнароднымі прававымі нормамі і настойлівымі заклікамі Еўрасаюза адмовіцца ад пакарання Кавалёва і Канавалава, пацягне за сабой сур'ёзныя наступствы для Лукашэнкі з боку Захаду.

Спікер Еўрапарламента Марцін Шульц выступіў з рэзкім асуджэннем расстрэлу Уладзіслава Кавалёва:

- Я шакаваны паведамленнем аб расстрэле Уладзіслава Кавалёва ў Беларусі. Ад імя Еўрапейскага парламента я шлю спачуванні яго сям'і. Я глыбока шкадую, што беларускія ўлады не прыслухаліся да заклікаў спыніць выкананне смяротнага прысуду з боку структур ЕС і міжнародных праваабарончых арганізацый. Я заклікаю ўлады Беларусі праявіць чалавечую годнасць і вярнуць цела сям'і. Пахаванне ў ананімнай магіле проста агідна і недапушчальна ў Еўропе 21 стагоддзя.

З асуджэннем пакарання выступілі таксама старшыня ПАСЕ Жан-Клод Міньён, генеральны сакратар СЕ Турб'ерн Ягланд, міністр замежных спраў Германіі Гіда Вестэрвеле, а таксама кіраўнік ведамства канцлера Ангелы Мэркель - Рональд Пафала. Міністр замежных спраў Галандыі Уры Розенталь не толькі асудзіў дзеянні беларускіх уладаў, але і выступіў з заклікам да неадкладнага ўжывання санкцый.

Нагадваем, што пасля таго, як Лукашэнка адмовіўся памілаваць Кавалёва, Еўрапарламент даў беларускаму прэзідэнту час падумаць і перамяніць сваё рашэнне, адклаўшы галасаванне па праекце рэзалюцыі аб сітуацыі ў Беларусі на канец месяца. Цяпер жа, пасля таго, як гэты жэст быў праігнараваны, нічога не перашкаджае еўрапарламентарыям канчаткова прагаласаваць за ўвядзенне палітычных і эканамічных санкцый у дачыненні да рэспублікі.

**20.03.**
**svpressa.ru/society/article/53649/**

АЗІЯЦКІ НАПРАМАК

# ПОЧЕМУ В МОСКВЕ ЛУКАШЕНКО КУСАЛ ГУБЫ?

ГЛАВНЫМ ИТОГОМ САММИТА ЕВРАЗЭС СТАЛО РЕШЕНИЕ ПОВРЕМЕНИТЬ С ЛИКВИДАЦИЕЙ ЭТОЙ ОРГАНИЗАЦИИ. ГЛАВА БЕЛАРУСИ ПРЕБЫВАЛ В МОСКВЕ НЕ В ЛУЧШЕМ РАСПОЛОЖЕНИИ ДУХА, А НА ФОТОГРАФИЯХ ВИДНО, КАК АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО ДАЖЕ КУСАЕТ ГУБЫ. ПОЧЕМУ БЕЛОРУССКОЕ РУКОВОДСТВО ЧУВСТВУЕТ СЕБЯ ДИСКОМФОРТНО?

По мнению политического обозревателя еженедельника «Белорусы и рынок» Павлюка Быковского, участникам саммита не удалось договориться по основным вопросам и это свидетельство «достаточно серьезных противоречий». Странам-партнерам России есть что терять — значимую часть суверенитета.

**Придется пускать предприятия с молотка**

— А белорусская сторона, наверное, не смогла получить ни очередного транша кредита от Антикризисного фонда ЕврАзЭС, ни обещаний на сохранение серьезных преференций со стороны России на ближайшее будущее, — отмечает эксперт.

То, что известно широкой аудитории о ценах на газ, не в полной мере выглядит как однозначно выигрышная позиция для белорусской стороны. Ведь там есть и такой пункт, как возможность потребовать от белорусской стороны одномоментно выкупить все акции «Белтрансгаза». Что касается нефти, то пошлины, которые Беларусь вынуждена платить в российский бюджет, во многом снимают ту выгоду, которую страна получила, согласившись вступить в этот евразийский проект.

У загвоздки в получении последнего транша кредита АКФ ЕврАзЭС есть официальные объяснения, касающиеся невыполнения белорусской стороной обязательств по госпрограммам — поддержке за счет бюджета отечественных производителей, например.

— Государственные программы превышают разрешенный кредитным соглашением объем. И уже это достаточное основание, чтобы не перечислять очередной транш кредита, — напоминает Павлюк Быковский.

Белорусское руководство вынуждено пускать с молотка ряд предприятий: на два с половиной миллиарда долларов надо продать собственности, поскольку это одно из условия получения дальнейших траншей кредита.

— Сейчас, когда идет холодная война с Западом, для российского капитала скупка привлекательных белорусских активов — просто дело техники.

Это весьма опасная перспектива, учитывая разность масштабов Беларуси и России, — отмечает политолог Александр Класковский.

**Делиться прерогативами белорусское руководство не намерено**

По мнению аналитика, Александр Лукашенко кусал губы еще и потому, что чувствует опасности втягивания в евразийскую интеграцию.

— Но у него, по сути, нет выбора. Точнее, он сам перечеркивает европейскую альтернативу такими вызывающими шагами, как введение «черного списка» невыездных или же расстрел двух людей, обвиненных во взрыве бомбы в минском метро, — отмечает аналитик. — Официальный Минск сейчас вынужден подыгрывать Кремлю и не раздражать Москву, поскольку мосты на Запад сожжены, экономика «сидит» на российской игле.

Сами по себе итоги саммита, по мнению аналитика, являются промежуточными.

— Беларусь, худо ли бедно, но какие-то плюсы получает именно от самого процесса участия в реализации кремлевских проектов. Самое главное, что на несколько лет вперед получены дешевые энергоносители, — обращает внимание эксперт.

Однако и проблем много. Во-первых, разные экономики: Россия и Казахстан — сырьевые страны, Беларусь — сборочный цех.

— Уже по этой причине трудно состыковать их — вот почему так мучительно бьются вокруг тарифов и цен на энергоносители, — полагает Александр Класковский.

Белорусская экономика является практически нерыночной, а в Казахстане и России рыночные реформы пошли гораздо дальше. И третья причина — это нормативные рамки Единого экономического пространства, которые в скором времени принудят координировать, в частности, макроэкономическую и финансовую политику, что для белорусского руководства тоже весьма неприятно.

Александр Класковский подытоживает: впереди все меньше будет пряников и все больше напрягающих моментов, не говоря уже о том, что переход на общую денежную единицу и делегирование иных полномочий наднациональным органам будет чем дальше, тем больше грозить утратой элементов белорусского суверенитета.

**Геннадий КОСАРЕВ.**

ВАЛЮТНАЯ ВЫРУЧКА

# Ці падзеліцца дзяржава валютнай выручкай з народам?

БЕЛАРУСКІЯ ЎЛАДЫ ДАЮЦЬ СПРАВАЗДАЧУ ПЕРАД НАСЕЛЬНІЦТВАМ АБ РЭКОРДНЫХ ТЭМПАХ РОСТУ ВАЛЮТНАЙ ВЫРУЧКІ І НЕБЫВАЛЫХ СУМАХ ЯЕ ПРЫТОКУ Ў КРАІНУ. НА ЯКУЮ ЧАСТКУ ВАЛЮТНАГА ПІРАГА МОГУЦЬ РАЗЛІЧВАЦЬ ШАРАГОВЫЯ БЕЛАРУСЫ?

- Сітуацыя ў эканоміцы цяпер адносна раўнаважкая, таму тэарэтычна павышэнне выручкі прапарцыйна павінна садзейнічаць далейшаму павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва. Аднак на практыцы гэтага не адбываецца, - адзначае эканаміст Сяргей Чалы, падкрэсліваючы, што паміж ростам экспарту і дабрабыту насельніцтва хутчэй існуе не прамая, а зваротная сувязь.

- Знешняя канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі і гандлёвы баланс палепшыліся як раз дзякуючы падзенню рэальных даходаў і ўзроўню жыцця, дэвальвацыі і, адпаведна, скарачэння вытворчых выдаткаў у даляравым выразе, - кажа эксперт. - Але калі прадпрыемствы здолеюць зарабіць дадатковую валюту, яны цалкам могуць дзяліцца заробленымі грашыма са сваімі работнікамі.

А вось дзяржава, паводле яго слоў, выгодамі, атрыманымі ад Расеі, ні з кім дзяліцца не збіраецца.

- Мы выходзім на дадатнае сальда, у тым ліку і за кошт скарачэння кошту газу і нафты. Аднак ўнутраны кошт застаецца нязменным, было гэта 245 даляраў за кубаметр газу або цяперашнія 165 даляраў, - аргументуе Сяргей Чалы.

Дадатковыя грошы ідуць «у бюджэтную скарбонку». У выніку іх могуць атрымаць некаторыя катэгорыі бюджэтнікаў. І можа да парламенцкіх выбараў штонебудзь падкінуць.

**Андрэй Саковіч.**

**Заснавальнік і рэдактар:** Станкевіч Георгій Мікалаевіч

**Адрас рэдакцыі:** Бешанковіцкі раён, в. Старыя Ранчыцы, e-mail: stan62@list.ru, тэл. 37455, маб. +375292184739

**Падпісана да друку 28.03.2012 у 17.40.**
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на ўласным абсталяванні.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.